Цэна асобнага нумэру 5 кап.

# НАША НІВА

Выходзіць што тыдзень

Адрэс рэдакціі і адміністрацыі: **Вільня, Віленская вул., № 29**

Цэна с перасылкай і дастаўкай на 1 г. 2 р. 50 к., на 6 мес.—1 р. 25 к. на 3 м.—65 к., на 1 мес.—25 к. За граніцэй: на 1 г.— 4 р. на 6 мес —2 р 3 мес.—1 р. Пераменa адрэсу— 20 кап.

Абвесткі прыймаюцца на апошняй страніцы па 20 кап. за лінейку малымі літэрамі. Рукапісы і карэспандэнціі, прысланые у рэдакцію, павінны быць чытэльна напісаны с праўдзівай фаміліей і адрэсам таго, хто яе прысылае. Можна таксжэ падпісаць прозвішчэ разам з фаміліей, хто не захочэ, каб была надрукавана праўдзівая фамілія. Адрэс і фамілія тылькі для ведама рэдакціі. Рукапісы аўторам не вяртаюцца назад

Год IX. 31 Студня 1914 г. № 5


## Ад Рэдакціі.

Дзесяць гадоў таму назад, у 1903 (на Каляды) і у 1904 (на Вялікдзень), кружок пецярбурскіх студэнтоў беларусоў выпусьціў у сьвет „Колядную“ і „Вялікодную пісанку“. Тады друкаваць штоколечы па беларуску забаранялося і пісанкі выйшлі тайна, літаграфаваные, кожная займала адзін аркуш паперы. Гэта былі першые прадвесьнікі адраджэньня Беларусі. На тую памятку сёлета рэдакція выдала на Каляды „Колядную пісанку“ 1913 г., а на Вялікдзень хочэ выдаць «Вялікодную пісанку» і хочэ каб гэта кніжка адбіла у сабе, хоць меней болей, думкі і настрої сучаснай Беларусі, каб з яе можна было бачыць, што зроблена за 10 год і якіе нашы сілы цяпер і надзеі на будучыну.

Дзеля гэтаго звертаемся да усіх нашых пісьменьнікоў с прозьбай прысылаць у «Вялікодную пісанку» на імя рэдакціі стацьці, апаведаньня і вершы. Апрача бэлетрыстыкі трэба каб нашы пісьменнікі пастараліся даць і паважнаго матэрьялу: навучнаго, публіцыстычнаго і літэратурнаго характару. Матэрьялы трэба прысылаць не пазьней канца лютаго месяца, а то лепей калі раней.

Апрача гэтаго Рэдакція звертаецца да ўсіх сваіх чытачоў і супрацоўнікоў каб яны прылажыліся да выданьня „Вялікоднай пісанкі“ грашмі, бо рэдакція сама коштоў друку пакрыць ня здолее.

І мы засьцерэгаем, што кніжка выйдзе такой велічыні, сколькі збярэцца дабравольных складак на гэту мэту.

Добра было-б каб з гордасьцю мы маглі сказаць падаючы чытачу тоўстую кніжку:—„Гэта з дабравольных складак паўстало, жыве Беларусь!“

## Наша праўда.

Што значэ праўда паняволенаго і абяздоленаго для сільнаго, калі непраўда дае яму „славу і гонар багаты“.

Хто будзе бараніць пакрыўджэнаго, калі ён крыўды сваей не выстаўляе, не гаворыць аб ей?

Цэлые сталецьця наш народ беларускі марнеў у нядолі. А ці закінуў хто слова за яго пакуль ён сам не прамовіў за сябе.

Нават імя беларускае вычэркнулі с паміж імён жывых.

Але цяпер сталося: народ беларускі не памёр, ён жыў і устамі лепшых сыноў сваіх дапамінаецца сабе мейсца у кругу жывых і вольных духам.

І толькі сыны цемры і крыўды могуць выступаць проці нашаго права будаваць сабе лепшае жыцьцё, яснейшую будучыну.

І выступаюць і заваліваюць каменьнем і ломам дарогу нам да лепшаго жыцьця і ў імя роўнасці і братэрства ўсіх народоў, куюць нам ланцугі на цела і душу.

Фальш і непраўда гучыць у іхніх славах аб роўнасьці і брацтве, бо ня можэ быць роўнасці там дзе німа роўных.

Дзе адзін чэлавек прымірае голадам, а другі аплывае ў збытках, дзе адзін цёмны, а другому даступны усе скарбы навукі, дзе ёсць мужыкі і паны, дзе ёсць горшые і лепшые мовы, там ня можэ быць ні роўнасці ні брацтва, ні волі, а толькі могуць быць паны і нявольнікі.

Бо толькі роўны з роўным могуць гаварыць аб брацтве, а вольны з вольным аб волі.

У нашай-жэ Сьвятой Зямлі німа роўнасці німа і братэрства.

І нябудзе яго датуль, пакуль адвечны гаспадар зямлі гэтай будзе парабком, батраком і наймітам, а тые, што гаворуць да нас чужой мовай, ўласьнікамі багацтвоў, прасьветы і навукі

Дарога да роўнасьці і праўдзіваго, не лганаго брацтва, ляжыць праз роўнасць культурную і экономічную.

Датуль, пакуль беларус будзе малакультурны і бедны, ён будзе косцю нязгоды паміж рознымі „культурнікамі“, мэтай памаўзлівай прагавітасці для тых, каторые на чужой крыўдзе будуюць свой гонар багаты.

**Юры Верэшчака.**

## З нашаго жыцьця.

**Аб выхадзе на хутары.**

Многа дзе селяне выйшлі на хутары, шмат вёсак збіраюцца. Добрая рэч хутары: земля блізка, у каторых і сенакос пад бокам; работа ідзе скора, ня трэба цягнуцца за колькі вёрст у канец сваe ніўкі. Можна зямельку лепей даглядзець, ня трэба, хоць сырое, але збіраць, бо, калі астаўся, спасуць. Знойдзецца і лішка часу, які можна скарыстаць на што небудзь другое. Ідзеш на хутар — даюць табе без працэнтоў 150 р. на падмогу (трэба аддаць праз 15 гадоў), прышлюць аграномніцкаго старасту для навучэньня, як лепей араць, сеяц і інш. Чаго больш жадаць, здаецца усе павінны толькі дзякаваць. Але выходзіць саўсім што іншае. Прыедзе чыноўнік, пагамоніць, ды усей справе канец. Хто мае больш зямлі — згаджаецца, але нічога ня зробіш с тымі, якіе маюць, напрыклад, 2 або 1 дзесяціну. «Цяпер мая кароўка і конік ходзіць па суседнім, суседні па маём, а тагды на сваім шнурку што зраблю? А будоўлю перэнясьці? І цяпер хлеба нідахват, а тагды саўсім памру з голаду». Страх галоднай сьмерці, ды страх, з яго погляду, саўсім праўдзівы, саўсім збівае с панталыку тых, каторые хочуць усіх скарэй пасадзіць на хутары.

Нідаўна жаліўся мне супрацоўнік Ігуменскай землеустраіцельнай Камісіі, што «мужыкі» ня хочуць ісці на хутары ня гледзячы на помач якую даюць ім. У гэтым вінаваціў ён толькі «упрамства мужыка», які «каб ешчэ Бога ні баяўся, сам чорт ні даўбы яму рады». Я спытаў: „як жэ жыць на хутары, калі адна дзесяціна, дзе ўзяць грошы на лубін, парашкі?» Ен адказаў: «Трэба прадаць хутар і купіць болей зямлі, бо на хутары, у якім 3 ці 4 дзесяціны, жыць нельга; банк дае помачы 90%». Шкада кажу яму: „вось я ведаю пана, што прадае па 250 руб. дзесяціну, а банк па сваей ацэнцы даў толькі 75 руб. на дзесяціну, дык скуль возьме бедак ешчэ 175 руб.?“ — „Я ужо тут нічога ня ведаю, ні маё дзела“.

## Вечэр варожб, або Васілева куцьця.

Калісь даўно у далёкую мінуўшчыну нашы русавалосые Беларусы звалі апошні вечэр старога году Вечэрам Варожб.

Самоназваньне паказывае што значыў ён для нашых прадзедоў. Яны будучы землеробамі, стараліся уцяміць з розных варожб, што адбываліся у сказаны вечэр, якая будзе у летку урода на полі і што з ею станецца; ці шчасьліва збяруць Божы дар, ці можэ град збажыну выб'е і т. п.

Аб абрадах, якіе калісь пры варожбах адбываліся, нават найстарэйшые сучасные селаке і селачкі (селяне і селянкі), у каторых я пытаўся не маглі сказаць ні слова.

Адна тыкеля 85 гадовая бабулька з нашай вёскі (вёска Дубавая, Грод. губ. Сокольскаго пав.), расказала мне агулам, што яна памятвала аб гэтых старых звычаях.

Паводле яе слоў, у вечэр 31 сьнежня сабіраліся цэлые семьі на сумесны банкет. Прыходзілі тут аддзеленые сынэ са сваімі дружынамі да бацькоў; сходзіліся братэ асобна жыўшые да старшаго брата, калі бацькоў не было, і усе у аднэй хаці спабывалі стары і перэймалі Новы Год. Калі між імі бывалі якіесь сваркі ці нязгоды, то у гэты час заціхалі. Калі узноў каторому брату або сястрэ блага жылося, то яму усе памагалі радай, нават давалі падмогу, як яна была патрэбна, словам, гэты вечэр быў вечэрам сямейнай еднасці.

На банкеці Васілёвай Куцьці, першай, абрадовай стравай быў аўсяны кісель, густая куцьця з макам, селядцэ, і інш. Усё адбывалося так сама, як на куцьцю перэд Калядамі.

Па вячэры гаспадар уставаў найпершы з за стала і выходзіў у прымен *). Вярнуўшыся назад абвешчаў сабраўшымся прыход даражэнькаго госьціка. Пачуўшы такую навіну усе падымаліся на ногі, каб прывітаць новапрыбыўшаго. Стоючы паглядалі на дзьверы. Але госць доўга ня ўходзіў у сьвятліцу. Тады гаспадар пытаўся у стаячых:—«Чаго-ж вы госьцікі стаіця?» — а усе гуртам атказвалі: — «Стаімо каб пачэсна павітаць прышоўшаго госьця». Гаспадар атказываў: «Ну дык вітайця, бо ён ужо прыйшоў, а гэтым госьцям ёсць Новы Год».

Учуўшы такую мову пана Гаспадара усе грамадой, з вясёлымі падскокамі, наперарыў пеялі:

Ідзі, ідзі Новы Год,
Скажы нам наўпярод,
Што каму ты нясеш?

Ці ідзеш ты да нас,
Каб даць ўсім шчасны час?
Ты Новенькі наш!

Ці нясеш ты каму
Сьмерць, як году таму?
Ты міленькі наш?

Далейшых слоў гэтай песьні старая бабулька не памятвала, хоць змест яе ведала.

—„Адгэтуль, мае дзеткі,—казала яна,—пеялася гэта песьня на палову с плачам, дзеля таго, што у песьні людзі жаліліся прад Новым Годам, моў прад Богам, на свайго ліхога пана.—а бывалі паны усякіе, і дужа ліхіе,—прыпаміналі дазнаные крыўды ад дворных служак і ўрэшці прасілі Бога, каб было крыху свабадней жыці у наступным годзе».

Ведама, што жаль гэты зусім на мейсцы і зусім справядлівы...

Пасьля песень наступалі розные варожбы, а дзеля гэтаго і сам вечэр зваўся вечэрам Варожб. Варажылі усе малые і старые, хоць у варожбы і не саўсім верылі.

Гэтак было калісьці, але аб гэтым рэдка хто памятвае. Цяпер нічога падобнаго не бывае. Адны дзеўчаты не забываюцца аб гэтым вечэры і сабіраюцца каб паваражыць. Гэтые варожбы крыху цікаўны і я апішу як яны у нас адбываюцца.

Дзеўчаты стараюцца пазнаць з варожб, што іх жджэ; які будзе муж, удавец ці маладзён? ці хутка гэты суджэны, раджэны прыедзе у сваты? і ці якога нешчасьця не здарыцца маладзенькай дзяўчыне? Такіе пытаньня вельмі цікавяць маладых і паспеўшых пайсці да людзей дзеўчатак. Кожда з іх з вялікай нецярплівасцю жджэць, каб як найхутчэй прыйшоў вечэр Васілёвай Куцьці і каб хутчэй аткрылося перад вачыма незнаная і таёмная будучына. Ужо ад самай раніцы сядзіць бедная дзяўчынка і падумывае які бы пояс забраць на вечэр Варожб. Бедненькае сэрцэ з нейкім страхам перад гэтым вечэрам моцна бьецца у белых дзявочых грудзях.

Але ось і вечэр жданы прыйшоў.

Настала часіна, калі усе дзеўчаты сабраліся у адну хату. Тут яны рупна аглядаюць кутке і закутке, каб ніхто з дзяцюкоў не падслухаў іх дзявочых гутарак і песень, ды не падгледзіў прарочых абрадоў. Па агледзінах

*) У нас сені называюць прымнам.

Ен нічога ня ведае, яму і ведаць ня трэба, абы пасадзіць на хутар, а тагды—тваё дзела! Скуль жа селянін уведае? Ен толькі добра ведае, што хлеба нідахват, трэба плаціць падаткі, а грошы німа! Добра ведае, што ахвотнікоў да яды ўсё больш ды больш, а ніўка не расьце! Сямейка дзякаваць Богу, а ураджаі не правяцца. Дзед казаў мне, што капа жыта давала чуць ня 3 асьміны, а цяпер—асьміну. Мне скажуць, што трэба, акром гною, сеяць лубін, купляць парашкі. І я гэта добра ведэю, але саўсім нізгадаю, гдзе селяніну узяць грошы на гэтые рэчы?

Кажуць на хутарах добра жыць. І ня думаю вясьці споркі: карысьць відавочная Але ўся беда у тым, што ніхто няхочэ бачыць, як пачаць жыць на іх, ці вялікая карысць зьмяніць сялібу ды гэтак сама карпець, як дзяды? Даюць падмогу 150 руб. Ці можна за гэты грошы перэбудавацца, зрабіць агарожу, выкапаць калодзезь? Відаць, калі звярнуць увагу на дарагоўлю. Нічога ня зробіш, трэба пазычаць грошы. І пазычае на 10 або 15%! А сыскаць адкуль гэткі шалёны працэнт? Зямелька цяпер больш за 5—6% нідае.

Прыедзе аграноміцкі стараста, скажэ сеяць лубін, пасеваць ніўку парашкамі, сам робіць пробы. Кожны бачыць, што добра, але... за што купіць? Каб зямелька лепей радзіла, мала умець рабіць, трэба мець грошы ды палажыць у яе, тагды і яна верне с працэнтам

Я чуў гэткую байку. Да багатаго купца зайшоў старэц прасіць помачы, бо німа чаго есьці. Купец і кажэ: „калі німа чаго есьці, еш хлеб з маслам“. Вось заўсёды, калі пачую, што пачынае хто небудзь ганіць селяніна за яго нярупнасць каля зямлі, што не карыстае з навукі, якая здабыла рады для палепшэньня ураджаю, узбегае на памяць гэта байка. Вінаваціць у тым, чаго ніколі ён ня чуў, чаго ня можэ зрабіць па свaей беднаце — нельга. Адчынеця яму вочы, дайця танны крэдыт, пакажэця на практыцы усю розніцу ад лепшаго догляду зямлі, тагды вінавацьця. «Самі павінны закладаць банкі, хаўрусные таварыствы», пачую. Але ён ня ўмее, а хто умее, няхочэ. Ды селянін ні надта верыць ім, бо яны саўсім адракліся сваіх братоў. Зрабеця, каб у школах дзеткі вяскоўцы вучыліся усяму таму, што датычэ гаспадаркі, якой яны будуць жыць, тагды і бацькі з ахвотай будуць выпраўляць, бо будуць бачыць карысць для сябе. „У салдаты ня пойдзе, ніхай лепей да работы прывучваецца“, часта пачуеш. Але вучыцца ён ешчэ і піць і у карты гуляць дома будучы: прыклад бярэ з бацькоў. Вот пьянства і карты п Аўрэйцэвіч (№ 2 «Н. Н.») і лічыць „чаcткай таго нешчасьця, якое не дае праменям асьветы пранікнуць у вёску“. А ці ня цемрач вінавата, што гэтак робяць? Ці вінават бацька, што гэтак узгадаваўся, дзед? Ці не вінаваты тые, па чыёй прычыне ён зрабіўся гэткім?

**Зрэбны.**

# Песьня.

**(З народных матываў).**

Ах, аткуль-жэ гэта вестка,
Што удовіна нявестка
Мужа роднаго зрэклася
І чужому аддалася.
Як пашоў муж на вайну
Ў чужэ-дальню старану?

Спадабала маладога,
Як ешчэ ў жыцьці нікога, —
У садочэк з ім хадзіла,
Зоркі ясные сачыла,
Не знаходзіла аднэй,
Што сьвяціці мела ей.

А удоўка сыну пішэ,
Што нявестка ўжо калышэ
У калысаццы малое
Не яго, але чужое...
Прыежджай хутчэй, сынок,
Бяры жонку пад замок!..

Не бядуй, удоўка-маці,—
Ўсей бяды не збедаваці, —
С чужэ-дальняе старонкі
Сын твой вернецца да жонкі,
Будзе суд над ёй судзіць,
Як з другімі ў сад хадзіць.

Стаў пісьмо сынок чытаці,
Што пісала ўдоўка-маці,
Каня быстраго седлае,
І да хаты пасьпешае,
Дзе яго чэкае ўжо —
Маці, жонка і дзіцё.

Як прыехаў ён да дому,
Ня йшоў кланяцца нікому,
Толькі жонку сваю ўбачыў,
Як над дзіцем горка плачэ,—
Даставаў ён востры меч,
Галаву знімаў ей с плеч.

З маткай роднаю стрэчаўся,
Не вітаўся, не прашчаўся,
Не маліўся Спасу Богу,
Зноў каня седлаў ў дарогу, —
З ветрам буйным ехаў жыць,
Галаву на век злажыць.

**Янка Купала.**

Акопы 2/VII—13 г.

# Думка.

Ой, зашумела, ой, загудзело
Тое бязмернае морэ!
Хваля за хвалей далей і далей
Мкнуцца па вольным прасторы.

Мкнуцца і скачуць, жаласна плачуць,
А я сяджу ды сумую..
Вецер прыскочыў, штось мне скрыгочэ,
Ветру ў ватказ гавору я:

—Што воды гоніш, што сосны клоніш,
Што морэ так уздымаеш?
Сядзь лепш ціхонька, ды вей лягонька!
—Гэй, чаму-ж так уздыхаеш?..

—Ой, маю волю, ой, маю долю
Бура ужо затаптала
Ды мне шумеці, ды мне гудзеці
Гэтак яна прыказала.

Так я і плачу, так я і скачу
Па гэтым сінім прасторы;
Глянь! хваля ў хвалю далей і далей
Грозна бунтуе ўсё морэ!

**Алёна Цэпрынская.**

# З Беларусі і Літвы.

## З Віленшчыны.

### Беларуская вечарынка.

У нядзелю 26 числа г. м. у залі „Сокол“ адбылася беларуская вечарынка. На сцэні пастаўлена была музыка, дэклямацыя і танцы.

Музыка сышла хараша.

З дэклямацыей выступала чатырох чэлавек і апрача першаго вядомаго ужо беларусам дэкляматара А. Бурбіса, усе тры іншые дэкляматары гаварылі добрые па зместу вершы, але ні дыкціі, ні пачуцьця, ні зразуменьня зместу таго, што гавораць!

Танцы далі прыгожы, мілы воку і сэрцу беларуса малюнак, выпоўнены былі з жыцьцём і хараша, але і тут як скрыгат зялеза аб шкло убіўся дысонанс і разіў душу і вуха: у песьні да танцу „Юрка“ пеялі: шчыра „зімушка“, „саломушка“.

А ешчэж гэтак нідаўна Максім Горэцкі пісаў у „Коляднай пісанцы“ да мастакоў і мастачак беларускаго тэатру: «Вы, настаўнікі красамоўства і прыгожай гаворкі, тое што вы скажэця добра са сцэны укладзецца у душу беларускую“.

Наставілі... *В. Л.*

**Лынтупы**, Віл. губ.

Ад Лынтуп да Свенцян гасцінец ляжыць пры самай лініі чугункі. У восень калі ставілі для чугункі зашчыту ад сьнегу, то яе памясцілі на другім баку дарогі, з гэтай прычыны дарогу усю так занясло сьнегам, што прыходзіцца ехаць с канём па лініі. Адзін чэлавек едучы гэтак папаў на жалезнадарожны мост, дзе конь яго і завяз. На шчасьце машыністы заўважыў, затрымаў машыну, і людзі выратавалі каня. Другі выпадак кончыўся горэй: на гэты самы мост узьехаў селянін Ескевіч з вёскі Януковічаў і машына пакрышыла яму каня і сані на дробную капусту. После гэтых вападкаў далі для праезду другую дарогу. Адно, заходзіць пытаньня: аб чым да таго часу думало чугуннае начальства? Маем мы у Лынтупах дзьве народные школы, але страшэнна перапоўнены, так што навым вучням німа мейсца. Варта былобы паклапоціцца тым, да каго гэта належыць, каб зменшылі шынкоў у нас а прыбавілі школу. Шыночкамі-ж нас Бог не пакрыўдзіў: маем манапольку, тры яуные шынкоўні, а тайным і ліку німа. Без гарэлкі ніхто тут і шагу не дасць, а воласць над усімі верх бярэ. Старшынёва хата пры вола-

хаты замыкаюць прымен, каб ніхто не увайшоў, і пачынаюць варажыць.

Перш наперш уносюць апалушку, у каторую кождая с сабраўшыхся дзеўчат кладзе свой пояс. Гэты пояс павінен быць новы і так зверчэны каб адзін яго канец абвязываў скрутачак зроблены на далоні (у такіе скрутачкі вясковые дзеўчаты заверчваюць новые паясэ). Як ужо усё гатова і паясэ зложэны, тады учасьніцы варажбы выбіраюць са свае чарадэ наймалодшую і найпрыгожшую, так звану, Апалайніцу. Па выбары Апалайніца бярэ апалушку і апалаець зложэные у ёй паясэ, а усе другіе ціхім хорам пяюць:

Сьвяты Апалас, чым хутчэй ідзі да нас,
Бо нам ў людзі пара,
Прышлі нам малойца прыгожаго сокала ясснаго,
Да людзей і да Бога шчаснаго.
Сявяты Апалас ой хучэй ідзі па нас.

Апалайніца апалае шпарка і так сама падсьпеўвае:

„Сьвяты Апалас“...

Пры гэтым апаланьні паясэ высока падзыгаюць і адны выпадваюць з апалушкі, а другіе развязываюцца, або зноў доўга астаюцца у апалушцы.

Чый пояс хутка выпадзець, то тая дзяўчына зараз пойдзе замуж, а чый доўга не выпадаў, то галубка, што яго прынесла ешчэ пасядзіць у старым гняздзе, самая менша—год. А як часамі пояс развяжэцца, о! то гаспадынцы яго напэўна здарыцца сорамнае нешчасцЯ...

Па апаланьні паясоў наступае выліваньне на воду растопленай цыны, або воску, лічэньне тыну і іншые варожбы. Растопленую цыну, або воск выліваюць у шклянку са сцюдзёнай вадой і кажуць:

Ой, цынка цыніца
Ці я буду маладзіца?
Хто прыедзе камне ў сваты
Жаўнер прыгожы, ці гаспадар багаты?

А пасьля глядзяць, што там вылілося. Як вылілася рэч падобна да меча, то суджэны-раджэны будзе прыгожым жаўнерам, а калі вылілася саха, ці якая іншая гаспадарская прылада, то муж будзе багатым гаспадаром.

Па выліваньні воску, выбегаюць дзеўчаты надвор лічыць тын, каб даведацца маладзён, ці удавец прыпадзе у мужэ. Лічэньне гэта адбываецца такім парадкам: падойдзе дзяўчына да плоту і пачынае ад пачатку лічыць тыніны да самаго канца кажучы „Гэта кол, гэта калец, гэта удавец, гэта маладзец“. І ужо калі апошняя тыніна прыпадзе на слова «кол», або «удавец», то суджэны-раджэны і будзе удавец, а як апошняя тыніна прыпадзе на слова „калец“, або „маладзец“, то і муж будзе прыгожым малайцом. Скончыўшы варожбы, а яны немаль заўсёды кончацца на лічэньні тыну, длеўчаты расходзяцца дамоў. Дзеля гэтаго, што наагул у прыгожым жаночым чародзе языкі доўгіе, то на заўтра амаль не уся вёска і ведае, што каторай варажыла Васілёва Куцьця.

Які пачатак Васілёвай Куцьці я ніяк ня мог даведацца. Старые селаке і селачке кажуць, што звычай гэты цягнецца ад нямомных часоў, а названьне яго выводзяць такім сказам:

Каліcь даўно нашые дзяцюке ня ездзілі у сваты, як гэта робіцца цяпер, але яны жанок сабе куплялі. Як ужо у катогаго бацькі дачке павырастаюць і захочуць выходзіць замуж, дык ён павінен вазіць іх па сёлах, каб каму колячак прадаць. Аднак справа гэта для самога бацькі нават тады, калі была ешчэ модная, разам была і прыкрай, ведама, — сьвяціць вачамі перэд людзьмі, калі дочке не ўдаліся. Ось з гэтай прычыны бацькі часта прасілі чужога чэлавека, каб павёз прадаваць іх дачок. Называўся ён Васілём. Васіль быў чэлавек лоўкі у языку і надта спрытны да гэтай справы. Ужо калі чужую дачку пасадзіць на свае цялежкі, то дамоў не прывязе, а прадасць напэўна і за добрую цану. Дык і меў ён, бедны, цягам працы па самые вушы. Усе да Васіля зверталіся с просьбай; адные каб дачку вёз да Клінчан, другіе каб да Іванаўцаў, а трэціе каб ешчэ дзе колек. І вазіў ён цэлы год. Вазіў вясной і летам, вазіў так сама і зімой. Атпачываў тыкеля у Вялікі пост і ў перэдкалядны пост. Ось аднаго году за Адвэнт сабралося так многа тавару, што бедны Васіль па Калядах вазіў, вазіў, дый завазіўся.

Якраз за два дні перад Новым Годам Богу душку аддаў. Усе яго моцна шкадавалі, бо быў добрым і услужным чэлавекам. Хаўтуры яго адбыліся 31 сьнежня, у апошні дзень старога году. Маладые дзеўчатэ па ём плакалі і галасілі цэлы дзень аж да вечэра а у вечэрэ пачалі варажыць і згадываць сваю будучу долю. Ось дзеля гэтаго с тых часоў і сам вечэр стаў называцца вечэрам Васілёвай Куцьці.

**М. Разамка.**

-сці як адбываюцца суды (кожны чэцьвер) перэварачываецца у праўдзівы рэстаран,—ужо у вечэр усе напіваюцца да белых чорцікаў.

*Падарожны.*

### За сьвітку.

На станціі Парафіяново (Вілейскаго пав.) быў такі характэрны на нашы часы факт. У залі першаго класу сядзелі тутэйшы багаты пан, Маліноўскі з другім багатым земляробам Хоцяновічам, каторые запрасілі да сябе на гутарку харачка селяніна. Гэта не спадабалося акцызнаму чыноўніку, каторы заявіў, што у першым класе ня можна сядзець шэрым людзям. Маліноўскі быў адзет так сама у шэрую звычайную селянскую сьвітку сказаў, што ён маець права сядзець у буфэце, бо ужо мае білет першаго класу і гэткі самы білет мае яго прыяцель-селянін, каторы едзе на станцію Буда, і Маліноўскі сказаў, што тут німа што разбіраць, хто шэры, а хто зялёны, ды што пад яго сермягай крыецца дарагая шуба, каторая болей варта як бліскучые гузікі акцызніка і зняў с сябе сьвітку, каторую быў адзеўшы ад сьнягу у дарогу, а каторая, як відаць ня ўсім прыходзіцца да смаку. І гэтае здарэньне прыпамінае словы паэты:

Хто наш звычай, ці ігрышчэ
На пасьмешышчэ падыме,
Што-ж з яго край родны зышчэ,
Што с пустой калітьі выйме.

*В—к.*

## З Міншчыны.

### С Піншчыны.

Німа большых ворагоў беларускаму адраджэньню, як рэнэгаты — «інтэлігенты», сыны Беларусі. Яны займаючы розные добра платные мейсцы, каб не ўпасць у няміласць тых, што ім плоцяць, ці хоць у падазрэньне што спагадаюць народу і яго цяжкай долі, яра на кідаюцца на кожнаго, хто адважыцца закінуць слаўцо на карысць беларускай мовы. У нашай піншчыне так паступаюць іншые сьвяшчэннікі з вышэйшай навукай, ды іншые вучыцелі рэальнай школы а за імі і другіе інтэлігэнты-беларусы. Праўдзівые маскоўцы слухаюць «патрыотоў» рэнэгатоў і празрыцельная усьмешка гуляе на іхніх устах. С пенай на вуснах даводзяць „патрыоты“, што беларуская мова гэта ня мова (не язык) а толькі гутарка (нарэчые), як кастромская і валагодзкая. Дзеля іх німа ні гісторыі ні філологіі (навукі аб мовах), ні этнографіі (навукі аб звычаях і абычаях). Божэ мой, як нізка можэ апусціцца чэлавек, калі у яго німа, ня тое што ідэалізму але нават простай парадачнасці! Страшма робіцца калі падумаць, да якога упадку можэ дайсці душа чэлавека.

= Пішучы гэтые радкі гаварыў нідаўна з адным беларусам-інтэлігентам. Гэты „сын Беларусі“ прызнае права Беларусі на нацыональнае адраджэньне, але ён дужа сумневаецца у тым, каб беларуская культура магла карысна змагацца з маскоўскай і польскай. «Мы ніколі ня будзем мець свайго Міцкевіча, Пушкіна, Сенкевіча і Толстого! Я-бы ахвотна працаваў для свайго народу, але мне здаецца, што гэта будзе дарэмная праца“,—кажэ ён.

Беларусы! Як удыхнуць сілу у слабое сэрцэ гэтаго нявернаго Хама? Памажыця радай!

*Argus.*

### Горкая праўда.

*(Бытцым казка з бабруйшчыны).*

Ужо было пад поўнач. Стары чорт сядзеў каля чорнаго стала, падпёршы кіпцямі сваю хару. — «Чорт яго ведае,—думаў ён,—што гэты малы чарцюк там робіць, ці цяпер я яго паслаў, а дасюль жаднай вестачкі аб сабе не дае. Крый чаго можэ і ён, гад, запанетваўся там на зямлі. Цяпер там Каляды, людзі павінны пьянстваваць, можэ і ён не уцярпеў і глынуў гэтаго зельля“. — Толькі ён так падумаў. як раптам дзьверы адчыніліся і ускочыў малы чарцюк. Тут стары чорт і накінуўся на яго.—«Ах ты зладзюга, што-ж гэта ты сабе думаеш! Усе мае чарцюкі даўно пазбіраліся, усе хоць колькі душачак с сабой прывялі, а ты, дасюль нейдзе прападаў і пэўне с пустымі рукамі ка мне зьявіўся?!“ — Пакланіўся тут малы чарцюк старому чорту, дый кажэ:—„Выслухайця мяне перш пане начальнік, а пасьля ужо крычыця. Я, пан начальнік. лётаў па зямлі, аж спацеў, але усюды, куды не памкнуўся, ужо ёсць другі чорт, ужо той арудуе. Успомніў я, што ёсць на зямлі такі куток, паміж лясоў і балот, дзе людзі дужа пьянствуюць. Паляцеў я туды, пад Магілёў, аж бачу: там ужо мой сябра, той рыжы чорт, арудуе; паляцеў я сціснуўшы зубы. далей. Уляцеў у міншчыну, зірнуў кругом, а бачу, адна Брадзецкая воласць ешчэ слабодна; я туды. Лячу і думаю, тутка-ж людзі павінны добра піць, бо заработкі вялікіе, а гарэлкі хапае. Раптам бачу, ідзе чэлавек. я к яму, бачу — гэта з Воступа Тамашонак (так яго там празываюць) Я зараз туды-сюды, падмануў другога чэлавека, шапнуў Тамашонку на вуха. каб папрасіўся пад'ехаць, сам ускочыў на развалкі і кірую ужо імі. Уехалі у вёску. я зараз паддаў ім ахвоты выпіць Зайшлі у вінапольку, напаіў я іх і думаю. во цяпер і вазьму я іх душачкі і аднясу пану Старшаму. Едзем гэтак мы далей. мароз цісьне, аж мне капытцы пачынаюць мерзнуць. Бачу я с Тамашонка пачынае душа выхадзіць, я барджэй за яе, ды і к вам пане старшы“.—«Добра, маладзец! хоць адну душачку прынёс—кажэ старшы.—«Што не гавары, а гарэлка добрае зельле. то там, то тут, а усё нам карысць. Ну, ну, брат, цяпер лезь на лежанку, троху пагрэйся, а посьле ізноў паляціш у тваю Брадзецкую воласць, можэ ешчэ каго цападзеш.

Эх. гарэлка, гарэлка, чортаво ты зельля, скольки душ ты губіш на гэтым сьвеці!

*Р. Н*

## З Гродзеншчыны.

### Вялікая Бэрэставіца

У гродзенскай губэрні ёсць мястэчка Вялікая Берэставіца, каторае славіцца торгам сьвінным і вялікаю стратаю гарэлкі Хоць народ тут і бедны, але гонару ня хочэ траціць і пасьледні кажух прапье, а выпье найбольш за ўсіх багатых і лічыцца першым майстрам у гэтым дзелі.

Ня можна не звярнуць увагі на тутэйшых мешчан, каторые першымі лічуцца па разбіваньню морды. Як прыдзе у нас аўторак і торг, так нашы хлопцы і ішчуць каб дзе спанатрыць дзела. Сперша бьюць вясковых, а посьле і сабе спусьцюць юшку. Агульные, грамадзянскіе справы у іх так сама добра наладжэны. Там, напрыклад, было так, што адзін чысьцейшы чэлавек зайшоўшы на сходку ледзьва вырваўся жывы і як яму другі раз сказалі ісьці, ён кажэ, што ужо тады завядзеця як умру, а цяпер нізашто не пайду.

Даўней хоць быў тут сякі такі вэтэрынар, а цяпер тут ніякага німа і жывіна праз якісь пусьцяк павінна гінуць.

Якось Бог пашкадаваў нашых людзей і даў было, на нейкі час мароз, то людзі маглі хоць прайсці праз мястэчка, а то ня толькі вазы, а самых мешчан выцягівалі вяроўкамі з гразі.

Затое у нас ёсць бойкі манаполь і 6 ці 8 піўных ды два рэнскіх погрэбы: адзін патайны, але таней прадае і ў кождым часе дастаць можна.

*А. Язьмен.*

### Нашы уласьці.

Гэтымі днямі Скідэльскі (Гродзенскай губэрні і павету). станавы прыстаў прыежджаў здымаць дапрос с селян жыдомленскай воласці аб справе вурадніка Мацешука. Аб гэтай справе расказываюць людзі во як:

Год таму назад у вёсцы Гароднікаx адзін селянін ставіў хату. Сусед хацеў каб не даць паставіць хату, дык узяўшы поўбутэлькі за пазуху ды чужога пеўня пад паху, пашоў жаліцца вурадніку.

Вураднік ласкава прыняў і паўбутэлькі і пеўня і абецаў забараніць ставіць хату. Ня ўспеў ешчэ прыйсці да хаты жалабшчык як вураднік апыніўся у Гародніках у старой хаці гаспадара, ставіўшаго новую хату, і кажэ: «Ну, Ванюкевіч, буду пратакол пісаць... Ты ведаеш!?»...—«Ведаю, ведаю.— спалохаўшыся. загаманіў Ванюкевіч,—як ня ведаць, што вы гаспадзін вураднік... Гануля, пячы каўбасу! Агата, бутэльку на стол! А у самога с кішэня шусь трырублёвая бумажка на зямлю. Вураднік глядзіць, што з гэтаго будзе. Ванюкевіч, угледзіўшы бумажку на зямлі, паднімае яе ды кажэ. „А, вы гаспадзін вураднік, бумажку згубілі!..“

Назаўтрае прыходзіць трэцьці селянін заявіць вурадніку, што у яго пеўня укралі. Увайшоўшы у кватэру вурадніка і угледзіўшы свайго пеўня, селянін нагнуўся каб узяць яго, але як не надыдзе гэтта вураднік з надворку ды таго селяніна у пічоку. ды у другую..

Абліўся крывёй селянін і ня ўцерпіўшы кажэ: „Моцны Божэ, гэта за сваё ўласнае!“ Але вураднік доўга не гаворучы падаў яму паперу да дзесяцкаго у каторай было пазваленьне ставіць новую хату на старым мейсцы..

А перад самымі Калядамі вураднік падвыпіўшы туга, на раз светку зайшоў у хату да селяніна у катораго была варта і пытае: — «Хто ты такі?» — «Сваей хаты гаспадар, адказаў той». „Я табе дам гаспадара,—закрычаў вураднік, — варта дзе? —„Яка..—пачаў селянін, але недагаварыў: вураднік як зьвер шалёны зламатаў яго. падваліў пад сябе і каб не бабы с качэргамі, то, мо на сьмерць задушыўбы невінаватаго чэлавека.

З больлю у сэрцы і ў целі селянін звярнуўся да станавога ісправніка ішчучы спогады.

Бадай што будзе цікавы на нашы часы суд.

*Е. Грайноўскі.*

## З Могілеушчыны.

Са **Мсціслаўшчыны** Мог. губ.

— У горадзі **Мсціслаўлі** задавіўся слёсар Сілівейстра. Прычына самагубства—доўгая хвароба. што й рады ёй не было Нябошчык пакінуў груд малых дзетак.

—**Ў Шамоўскай** воласьці. ў Цёмным Лесі пані Іванскай, дрэва забіло Мікалая Ханеўскаго. Яно было падрублено і паваліілося, але застрало на другім дрэві. Ханеўскі пайшоў паглядзець, як яго паваліць; тымчасам дрэва піхнулі. Ханеўскі -зірк! дрэва на яго ляціць, спужаўся і ня ўцёк. Так і знайшоў сваю сьмертухну.

Помніцца, як гады тры назад у Чартоўшчыні, лесі той жэ пані І-й, дрэвам забіло каня ды ў такога беднаго, маламожнаго чэлавека што ў яго адзін той конь і быў. І усё тое было як раз жэ прад вачамі п І—й; яна прыехала агледаць як лес сякуць. Смерць каня так напудзіла паню, што яна дала таму чэлавеку ажно 5 руб. Дала-б і болі, кажуць, але ён хацця праўда, і доўга без шапкі стаяў, ды ў руку не пацалаваў. У нас паном у рукі ешчэ цалуюць, і старые пані пілнуюць гэтаго: хто не пацалуець у руку той ужо „дэмакрат і неблаганадёжны“ і паны такога чэлавека ня любяць.

— У **Мсціслаўскім** павеці паміраіць многа людзей, найболі на хваробу жывата, мусіць ад дрэнной яды. І сярод Мсціслаўца, прыхільнаго да ўсякай чартаўні і забабоноў, ужо паўзуць чуткі, што ходзіць нейкая незвычайная хвароба. што ў Мядзьведзеві за якога паўмесяца памёрла 70 чэлавек, найболі маладых, што нашы дактары ня могуць прызнаць што за хвароба, плятуць, што запечаталі двух чэлавек і паслалі у Маскву... Старэйшые нашы бабулькі ужо гаворуць, бытцым-то «мусіяш»—антыхрыст незабавам прыйдзіць і пачнецца канец сьвету. Бабам—троху й страшна!

*Гурык Г.*

## З Вітэбшчыны.

### Пэдагогі.

У Полацку мейсцовые пэдагогі дадумаліся да вялікай рэформы: яны да спраў пэдагогікі прыцягнулі... гарадавых З гэтай мэтай кожнай гімназістцы выдалі асобные кніжкі, у каторые кожны гарадавік можэ запісаць, як вядзе сябе вучэніца на вуліцы. Во, што значэ увекавечыць свае імёны! Але ці ня сорамна такі, недзе у глыбіне душы, перэд самымі сабой, полацкім пэдагогам?

# З усіх старон.

### Праказа (тронд) у Расеі

У Пецярбурзе, у Бэсарабіі і Палтаўшчыне выкрылі цэлые семьі заражэные страшэннай пошэснай хваробай—праказай, каторая разгнаівае і за жыцьцё абарачвае чалавека у жывы труп. У срэдніх веках гэта хвароба панавала па ўсей Эўропе, цяпер яна толькі ведама у Азіі, Афрыцы і Расеі.

### Обыскі і арэшты.

= У Варшаве у кватэры гравера (вырэзчыка) Герштэйна зроблен вобыск. Знайдзена 10 тысяч жэтоноў с партрэтам Бэйліса. Жэтоны конфіскавалі, а Герштэйна арыштавалі.

= У Жванцы на аўстрыяцкай граніцы зрабілі шмат обыскаў і арэштаў сярод інтэлігенціі.

= У Адэсі 25 студня у ночы адбылося шмат аблаў на людзей. Арэштавана больш 250 душ, якіх разысківала паліція і судавые уласьці.

= У Харкаве былі обыскі і арэшты паміж сіоністамі.

= У Мэдоне арыштавана 8 гімназістак, каторых вінавацюць у разпаўцюджываньні нелегальнай літэратуры. У гэтым мястэчку нашлі тайную друкарню.

### Забастоўкі.

= У Харкоўскім унівэрсытэці, у звязку з назначэннем прафэсара Трыоклера, адбылася на ўсіх аддзелах забастоўка.

= У г. Астрозе, на Валыншчыне, забаставало 200 работнікоў паркетнай фабрыкі Зусьмана. Вымогі экономічные.

### Свабода слова і друку.

= Харкоўская адміністрація забараніла вядомаму публіцысту Жабоцінскаму прачытаць лекцію на тэму „Юдаізм і асыміляція“.

= Екацерынаслаўскае губэрскае прысутства аб таварыствах адмовіло зацьвярдзіць 21 таварыство—прафэсіональнай і ўзаемнай запамогі.

= Пецярбурская судовая палата засудзіла рэдактароў газэт: „Живая жизнь“ Васільева на 1 год

